■ Полюс інтарэсаў

# «НА РЭФЛЕКСІЮ ЧАСУ НЕ БЫЛО»

## Як прайшла чарговая беларуская экспедыцыя ў Антарктыду?

**З пяці яе ўдзельнікаў чацвёра пабывалі на белым кантыненце ўпершыню. Галоўнымі задачамі палярнікаў былі мантаж першага аб'екта новай станцыі, створанага на адным з нашых прадпрыемстваў, а таксама правядзенне навуковых даследаванняў па праграме Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Будаўніцтва, тым больш ва ўмовах вечнай мерзлаты і моцнага ветру, — задача не з простых. Менавіта таму ў склад каманды быў уключаны медык — урач-хірург Леанід НІКІЦЮК. Карэспандэнт «Звязды» сустрэўся з удзельнікам экспедыцыі адразу пасля вяртання на радзіму і распытаў яго пра работу і эмоцыі, якія ён атрымаў ад падарожжа ў Антарктыду.**



— Пачну з таго, што сам я з Брэста. Калі надышоў час атрымліваць адукацыю, паступіў у Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, але адразу пасля яго заканчэння вярнуўся на малую радзіму. Працаваў у хірургічным аддзяленні Брэсцкай абласной бальніцы і ні пра якія падарожжы на белы кантынент нават не марыў. Але лёс некалі звёў мяне з Аляксеем Гайдашовым — нашым славутым палярнікам і пастаянным кіраўніком нацыянальных антарктычных экспедыцый. Нават не ведаю, што падштурхнула яго зрабіць такі выбар: калі экспедыцыя шукала медыка, але пазваніў ён менавіта мне.

Я доўга не раздумваў над прапановай. Якраз склалася такая сітуацыя, калі і на працы мяне маглі адпусціць на даволі працяглы тэрмін, і сям'я была не супраць. Жонка нават узрадавалася, што яе мужу давераць такое адказнае заданне. З аднаго боку, гэта набыццё ўнікальнага досведу. З іншага — ёсць у такіх паездках пэўная доля рамантызму — пабываць на далёкім кантыненце і пабачыць гэтыя бясконцыя льды не кожнаму наканавана.

Вядома, я разумеў, што сутыкнуцца можна з самымі рознымі праблемамі. Работа там у любым выпадку ў некаторай ступені рызыка, але з ёй трэба мірыцца.

***— Ці былі ў вас якія-небудзь абавязкі, акрамя медыцынскіх?***

— Чатыры разы на тыдзень я быў кухарам, а таксама выконваў навуковую біялагічную праграму НАН. Я вывучаў жывёльны свет, напрыклад насякомых і паразітаў, збіраў узоры расліннасці, а таксама антарктычныя бактэрыі і мікраарганізмы з унікальнымі ўласцівасцямі, якія могуць быць запатрабаваны ў фармакалогіі і медыцыне. Апрацоўкай сабранага матэрыялу будуць займацца ўжо прафесійныя біёлагі.

***— Палярнікі шмат хварэюць?***

— Калі казаць пра вірусныя захворванні, то не, бо ў Антарктыдзе самае чыстае паветра на планеце. На першым месцы ў нашай экспедыцыі была прафілактыка траўматызму, бо мы займаліся цяжкай фізічнай працай па мантажы модуляў і тэхналагічных сістэм новай станцыі. Але нічога сур'ёзнага, на шчасце, не здаралася. Максімум — удары і іншыя дробязі. На другім — прафілактыка рызык узнікнення рознага кшталту вострых станаў, бо ўсе мы людзі. Але экспедыцыя прайшла без ускладненняў.

***— Што гатавалі калегам?***

— Тое самае, што і дома. У нас з сабой было шмат свежых прадуктаў, таму ад аднастайнасці страў мы не пакутавалі. На першае або боршч з капусты ці буракоў, або булён, на другое яшчэ што-небудзь, ну і абавязкова — кампот. На Новы год накрывалі святочны стол і гатавалі дранікі — такая вось святочная страва. Але быў і селядзец «пад футрам» — яго гатаваў Аляксей Гайдашоў.

***— На адпачынак часу хапала?***

— Скажам так, лішку дакладна не было, бо мы прыехалі не на курорт, а на адказную работу. Першым часам працавалі нават без выхадных, каб паспець выканаць мантаж у зададзеныя тэрміны, таму вольны час аддавалі амаль выключна на сон. Потым маглі адпачыць у нядзелю. Але, вы ж разумееце, на пляж там не сходзіш *(смяецца)*. Я браў з сабой кнігі ў электронным выглядзе, бо ў нас кожны грам грузу падлічаны. Павёз цэлую віртуальную бібліятэку. За час працы, напрыклад, каторы раз перачытаў «Дванаццаць крэслаў» Ільфа і Пятрова — выдатна падымала настрой. Аднойчы дазволілі сабе схадзіць усёй камандай на рыбалку, бо такой у Беларусі дакладна нідзе няма. Нават калі стаяла непагадзь — а штормы там страшэнныя — і працаваць было нельга па тэхніцы бяспекі, нам хапала работы ў памяшканнях станцыі.

***— Паўгода ўдалечыні ад дому, у замкнёным калектыве...***

— У нас, я лічу, склаўся выдатны калектыў. Можа быць, паўплывала тое, што большасць удзельнікаў былі навічкамі, таму было шмат тэм для стасавання. Ды і псіхалагічная ўстойлівасць у хлопцаў на ўзроўні. Што датычыцца суму па радзіме і блізкіх... Зноў жа скажу, на эмоцыі і рэфлексію банальна не хапала часу. Тым больш, з домам мы, бывала, звязваліся па спадарожнікавай сувязі — кожнаму за час экспедыцыі было дазволена 40 хвілін размовы па тэлефоне. Можна было выкарыстаць усё адразу, а можна было расцягнуць на паўгода.

***— Ці апраўдала Антарктыда вашы першапачатковыя чаканні?***

— Не проста апраўдала, але і пераўзышла. У любым выпадку, гэта вельмі яскравы этап у маім жыцці і працы. У першую чаргу, прыемна ўсведамляць, што ты выконваў важную і патрэбную для краіны задачу. Па-другое, безумоўна, «зачапіла» прырода, гэта нешта неверагоднае. Ледзяны купал, айсбергі, бясконцы снег — усё вельмі незвычайна. Гэта тое самае, што паехаць у любую краіну, дзе ніколі да гэтага не бываў — цікавай становіцца кожная дробязь. Вось толькі ў Антарктыдзе ўвогуле мала хто бываў *(смяецца)*.

***— Хацелі б адправіцца туды зноў?***

— Шчыра кажучы, я пакуль не думаў. Яшчэ дадому прыехаў не да канца, як кажуць, «галава яшчэ там».

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

■

# АСТРАВОК ДЛЯ САПРАЎДНЫХ БАЛЕЛЬШЧЫКАЎ

**У Мінску адкрылася фан-зона чэмпіянату Еўропы па футболе. Цяпер кожны ахвотны здолее паглядзець вялікі футбол на вялікім экране**

Спецыяльная зона для балельшчыкаў, якую падрыхтавала «Аліварыя», яшчэ ўчора запрацавала у парку Перамогі, непадалёк ад Банка развіцця. Упрыгожаная сцяжкамі крэйн-удзельніц, футбольнай атрыбутыкай, яна на месяц футбольных баталій у Францыі можа стаць невялікім цэнтрам балельшчыцкага асяродку ў сталіцы. Акрамя прысмакаў арганізатары прапануюць сустрэчы з футбольнымі экспертамі, майстар-класы ад футбольных каментатараў, конкурсы прагназістаў, спаборніцтвы на спрытнасць валодання футбольным мячом і нават моўныя курсы «футбольнай» беларускай і французскай. Дарэчы, **пасол Францыі ў Беларусі Дамінік ГАЗЮІ** завітала на адкрыццё фан-зоны.



Фота Надзеі БУЖАН.

— Гэтая фан-зона — вельмі добрая ідэя, — кажа спадарыня Газюі. — Маленькі астравок чэмпіянату Еўропы ў Беларусі. Самі спаборніцтвы распачаліся ў Францыі ў пятніцу і пройдуць у дзесяці гарадах. Я б хацела падкрэсліць франка-беларускае спартыўнае супрацоўніцтва. Некалькі гадоў таму французы і беларусы былі ў адной адборачнай групе чэмпіянату свету па футболе. Першы матч у 2012 годзе прайшоў у Францыі, а другі — у Гомелі. А ў 2014 годзе паміж сабой сустрэліся мінскае «Дынама» і «Генгам». А неўзабаве мы зноў убачым беларуска-французскую дружбу. Першы матч у адборачным турніры чэмпіянату свету — 2018, які пройдзе ў Расіі, Францыя правядзе ў верасні менавіта з Беларуссю.

У сваю чаргу з'яўленне ў сталіцы пляцоўкі для фанаў падтрымаў і **Сяргей РУМАС, старшыня Беларускай федэрацыі футбола.**

— Усіх нас аб'ядноўвае любоў да футбола, — адзначыў Румас. — Футбалісты гуляюць для балельшчыкаў. Гэта тая крэатыўная сіла, якая здольная ўплываць на выніковыя выступлення нацыянальнай зборнай. На жаль, наша зборная не гуляе сёлета ў Францыі, але нам усім хочацца верыць, што дзякуючы нашай актыўнай падтрымцы наступны раз у нас абавязкова атрымаецца выйсці ў групавы этап. Безумоўна, стварэнне такіх фан-зон, дзе балельшчыкі, што не могуць патрапіць на чэмпіянат Еўропы, змогуць тут, у прысутнасці сяброў, калег, «балець» за свае любімыя каманды, гэта крок наперад у папулярызацыі футбола. Упэўнены, гэтая ініцыятыва «Аліварыі» атрымае моцны штуршок.

Застаецца толькі дадаць, што фан-зона працуе ў дні матчаў з 15:00 да 24:00. Прыходзьце і глядзіце вялікі футбол!

**Якаў ЖУРБІН.**

# СВЯТА МУЗЫКІ І ПАЭЗІІ

**Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі «Маладзечна» праходзіць шаснаццаты раз. Лейтматывам сёлета стала знакавая дата — 75-годдзе з дня нараджэння мастацкага кіраўніка дзяржаўнага ансамбля «Песняры» Уладзіміра Мулявіна. Менавіта гэтаму чалавеку прысвечаны асноўныя мерапрыемствы фестывалю.**

Урачыстае адкрыццё песенна-музычнага форуму адбылося ўчора ўвечары на сцэне летняга амфітэатра. Гасцей фестывалю парадаваў Нацыянальны акадэмічны канцэртны аркестр. Падчас адкрыцця ўзнагародзілі лаўрэатаў нацыянальнага конкурсу маладых выканаўцаў беларускай эстраднай песні.

Сёння праграма працягваецца. На галоўных пляцоўках горада пройдуць шматлікія творчыя сустрэчы. Нацыянальны акадэмічны канцэртны аркестр сыграе яшчэ раз у 11.00 у Маладзечанскай дзіцячай школе мастацтваў. У 15.00 на канцэрт «Вясёлая сямейка» запрашае Нацыянальны цэнтр музычнага мастацтва імя Мулявіна Маладзёжнага тэатра эстрады. У летнім амфітэатры выступяць пераможцы і лаўрэаты міжнародных конкурсаў. Падтрымліваць юных «зорак» будзе вакальна-харэаграфічны ансамбль «Заранак».

А шостай вечара аматарам сцэнічнага мастацтва прапануюць наведаць спектакль «Пясняр», які пакажуць у гарадскім Палацы культуры. Пастаноўку па п'есе Васіля Дранько-Майсюка прадставіць Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Горкага. Рэжысёр — заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь Валянціна Ганькова. Ролю песняра выканае артыст тэатра і кіно Сяргей Жбанкоў.

Яскравым завяршэннем стане канцэрт «Беларусь — крыніца натхнення» (ён распачнецца ў 21.30) з удзелам «зорак» айчыннай эстрады. На сцэну амфітэатра выйдуць Іна Афанасьева, Ірына Дарафеева, Дзяржаўны ансамбль танца, вакальная група «Чысты голас», фальклорны гурт «Палац» і іншыя выканаўцы.

Акрамя таго, у суботу госці фестывалю змогуць наведаць выстаўку, прысвечаную Уладзіміру Мулявіну, пабачыць карціны з фонду Нацыянальнага мастацкага музея і паслухаць беларускіх паэтаў.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

■ Фінансы

# У ЛІПЕНІ СТАЎКА РЭФІНАНСАВАННЯ СТАНЕ 20% ГАДАВЫХ

**Аб гэтым гаворыцца ў рашэннях у галіне грашова-крэдытнай палітыкі, якія былі прыняты ўчора праўленнем і камітэтам па манетарнай палітыцы Нацыянальнага банка краіны.**

Такім чынам, менавіта **з 1 ліпеня зніжаюцца**: стаўка рэфінансавання — з 22 да 20 працэнтаў гадавых, стаўкі па пастаянна даступных і двухбаковых аперацыях падтрымкі бягучай ліквіднасці банкаў — з 27 да 25 працэнтаў гадавых, а стаўкі па пастаянна даступных аперацыях выключэння ліквіднасці банкаў — з 15 да 13 працэнтаў гадавых.

Спецыялісты прэс-службы рэгулятара паведамляюць, што сёлета **з 1 жніўня памяншаецца** гранічны ўзровень працэнтных ставак па новых тэрміновых банкаўскіх укладах фізічных асоб у нацыянальнай валюце, у выпадку перавышэння якога прадугледжваецца павелічэнне рэзервовых патрабаванняў, — з 1,0 да 0,9 стаўкі па пастаянна даступных аперацыях Нацбанка ў форме крэдыту авернайт.

Эксперты рэгулятара адзначаюць, што прыняццю гэтых рашэнняў спрыяла, перш за ўсё, запаволенне інфляцыйных працэсаў. Паводле інфармацыі Нацыянальнага статыстычнага камітэта, прырост спажывецкіх цэн у маі знізіўся да 0,5% у адносінах да красавіка гэтага года і да 12,4% — у адносінах да мая 2015 года.

Гадавы прырост сярэдняй шырокай грашовай масы сёлета ў маі склаў 18,9%. Дынаміка гэтага паказчыка фарміруе ўмовы для далейшага зніжэння інфляцыі, абумоўленай манетарнымі фактарамі. На фоне зніжэння кошту рэсурсаў на грашовым рынку гэта дае магчымасць працягваць палітыку па памяншэнні рызыка-прэміі ў працэнтных стаўках. У Нацбанку падкрэсліваюць, што далейшыя рашэнні ў галіне грашова-крэдытнай палітыкі будуць прымацца па меры фарміравання адпаведных макраэканамічных умоў з улікам комплекснага прагнозу развіцця эканомікі нашай краіны.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# ВЯРНУЛІ ПАРТФЕЛЬ З ВАЛЮТАЙ

**Падчас правядзення 26-й міжнароднай спецыялізаванай выставы «Белагра-2016» на тэрыторыі аэрапорта Мінск-1 да супрацоўнікаў АМАП ГУУС Мінгарвыканкама звярнуўся па дапамогу мужчына.**

Ён патлумачыў, што згубіў партфель, у якім знаходзілася буйная сума грошай — каля пяці тысяч долараў. Усе нарады, якія неслі службу на месцы правядзення форуму і прылеглай тэрыторыі, неадкладна прыступілі да пошуку прапаўшай маёмасці. Праз паўгадзіны партфель з усім змесцівам быў знойдзены і вернуты ўладальніку.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*